ЗАЦВЯРДЖАЮ
Начальнік упраўлення
культуры Гродзенскага
аблвыканкама
А.В. Клімовіч
1 лютага 2021 г.

**ІНСТРУКЦЫЯ аб парадку арганізацыі і правядзення абласнога фестывалю народных хароў і ансамбляў песні і танца “НАД СІНІМ НЁМАНАМ”**

1. Дадзеная Інструкцыя вызначае парадак арганізацыі і правядзення абласнога фестывалю народных хароў і ансамбляў песні і танца “Над сінім Нёманам” (далей – Фестываль).

2. Мэтамі і задачамі Фестывалю з’яўляюцца: пашырэнне музычна-асветніцкай дзейнасці харавых калектываў і ансамбляў песні і танца, удасканаленне выканальніцкага майстэрства дзеючых калектываў, актывізацыя творчай і канцэртнай дзейнасці, узбагачэнне рэпертуару аматарскіх калектываў лепшымі творамі беларускага мастацтва.

3. Арганізатарамі Фестывалю з’яўляюцца: упраўленне культуры Гродзенскага аблвыканкама, ДУК “Гродзенскі абласны метадычны цэнтр народнай творчасці”, аддзел культуры Гродзенскага райвыканкама.

4. Для кіраўніцтва падрыхтоўкай і правядзеннем Фестывалю ствараецца арганізацыйны камітэт (далей - аргкамітэт), які фарміруецца з прадстаўнікоў дзяржаўных органаў і зацікаўленых арганізацый (дадатак 1).

5. Аргкамітэт:

5.1. уносіць на разгляд упраўлення культуры Гродзенскага аблвыканкама прапановы па каштарысе выдаткаў на арганізацыю і правядзенне Фестывалю, умовах правядзення Фестывалю і відах заахвочвання ўдзельнікаў;

5.2. узгадняе склад рэжысёрска-пастановачнай групы, склад журы Фестывалю, спіс удзельнікаў Фестывалю, праграму правядзення Фестывалю, узоры ўзнагарод, іншую атрыбутыку, план мерапрыемстваў па падрыхтоўцы і правядзенні Фестывалю;

5.3. вызначае віды і формы інфармацыйна-рэкламнай падтрымкі Фестывалю;

5.4. вырашае іншыя пытанні, звязаныя з падрыхтоўкай і правядзеннем Фестывалю.

6. Фестываль праводзіцца 1 раз у 3 гады.

7. Фестываль прысвячаецца памяці народнага артыста Рэспублікі Беларусь, мастацкага кіраўніка Нацыянальнага акадэмічнага хору Рэспублікі Беларусь імя Г. Цітовіча, старшыне грамадскага аб’яднання “Беларускі саюз музычных дзеячаў”, лаўрэату Дзяржаўнай прэміі Рэспублікі Беларусь, лаўрэату прэміі “За духоўнае адраджэнне”, прафесару Міхаілу Паўлавічу Дрынеўскаму.

У 2021 годзе Фестываль адбудзецца ў снежні 2021 года на базе філіяла Абухаўскі цэнтр культуры ДУК “Гродзенскі раённы культурна-інфармацыйны цэнтр”.

8. У Фестывалі прымаюць удзел дзіцячыя і дарослыя калектывы з найменнем “народны”, “узорны”, званнем “Заслужаны”, хары народнай песні, ансамблі песні і танца (незалежна ад ведамаснай прыналежнасці), а таксама лепшыя вакальна-харавыя калектывы (альбо ансамблі песні і танца) без наймення “народны”, “узорны”.

9. У праграму выступлення кожнага калектыву ўключаюцца 2 творы: для вакальна-харавых калектываў (да 7 хвілін) - апрацоўка беларускай народнай песні *a cappella,* твор беларускіх аўтараў ці апрацоўка беларускай народнай песні; для ансамбляў песні і танца (да 10 хвілін) - вакальна-харэаграфічная кампазіцыя, твор на выбар (харэаграфічны нумар, вакальна-харавы нумар, вакальна-харэаграфічная кампазіцыя), прычым музычнае суправаджэнне - ансамбль народных інструментаў альбо якасная фанаграма “-1”.

10. Не дазваляецца выкананне 2-х твораў самадзейных аўтараў.

11. Выступленні калектываў ацэньваюцца па наступных крытэрыях: выканальніцкае майстэрства; сцэнічная культура; мастацкі ўзровень рэпертуару; арыгінальнасць апрацоўкі; рэжысура канцэртнага нумара; якасць музычнага суправаджэння.

12. Па выніках Фестывалю журы (дадатак 2) вызначае лаўрэатаў I, II, III ступені і ўзнагароджвае прызамі і дыпломамі ў рамках у наступных намінацыях:

народны (Заслужаны) ансамбль песні і танца;
узорны (Заслужаны) ансамбль песні і танца;
народны (Заслужаны) хор народнай песні;
узорны (Заслужаны) хор народнай песні;
вакальна-харавы калектыў (альбо ансамбль песні і танца) без наймення “народны”, “узорны”.

13. Дадаткова журы ўзнагароджвае ўдзельнікаў спецыяльнымі дыпломамі ў рамках і прызамі:

лепшая інструментальная (аркестравая) група;
за лепшую апрацоўку беларускай народнай песні;
за лепшае рэжысёрскае вырашэнне нумара;
за лепшае спалучэнне харэаграфічнага і вакальнага жанраў;

за яркае мастацкае ўвасабленне тэмы радзімы.

14. Астатнія ўдзельнікі фестывалю атрымліваюць дыпломы за ўдзел у фестывалі.

15. Журы пакідае за сабой права аб’ядноўваць альбо ўводзіць дадатковыя намінацыі ў рамках выдзеленага прызавога фонду Фестывалю, падзяляць лаўрэацкія месцы і вызначаць дадатковыя спецыяльныя прызы.

16. Рашэнне журы з’яўляецца канчатковым і перагляду не падлягае.

17. Для ўдзелу ў фестывалі неабходна аформіць агульны спіс калектываў-удзельнікаў ад раёна, заяўку (дадатак 3) на кожны калектыў асобна, зацверджаную начальнікам аддзела (сектара) культуры (адукацыі) гар(рай)выканкама, і даслаць іх да 10 лістапада 2021 года па адрасе: 230025, г. Гродна, вул. Савецкая, 8, ДУК “Гродзенскі АМЦНТ”, фестываль “Над сінім Нёманам”; кантактныя тэлефоны: +375152623802; тэл./факс: +375152623787; e-mail: omcnt@mail.grodno.by

18. Фінансаванне Фестывалю ажыццяўляецца за кошт сродкаў абласнога бюджэту, прадугледжаных у каштарысе ДУК “Гродзенскі абласны метадычны цэнтр народнай творчасці” на цэнтралізаваныя мерапрыемствы.

19. За кошт бюджэтных сродкаў фінансуюцца: аплата работы журы і вядучых, праезд журы (Мінск-Гродна-Мінск), прызы, спецыяльныя прызы, дыпломы, рамкі для дыпломаў.

20. Для фінансавання Фестывалю на ўсіх этапах могуць быць выкарыстаны іншыя крыніцы, не забароненыя заканадаўствам Рэспублікі Беларусь.

21. У сувязі з эпідэміялагічнай сітуацыяй арганізатарамі Фестывалю дапускаюцца змены ў дадзенай Інструкцыі аб парадку арганізацыі і правядзення, дапускаюцца змены фармата, у тым ліку дыстанцыйна, абласнога фестывалю народных хароў і ансамбляў песні і танца “Над сінім Нёманам”, а таксама перанос даты правядзення да стабілізацыі сітуацыі (у іншыя тэрміны).

22. Арганізатары Фестывалю захоўваюць неабмежаваныя правы на запіс і распаўсюджванне выступленняў калектываў рознымі тэхнічнымі сродкамі і спосабамі. За дадзеныя запісы ганарары выканаўцам не выплачваюцца.

Дадатак № 1
да інструкцыі аб парадку арганізацыі і правядзення абласнога фестывалю народных хароў і ансамбляў песні і танца
“Над сінім Нёманам”

СКЛАД АРГКАМІТЭТА

| | |
|---|---|
| Клімовіч А.В. | начальнік упраўлення культуры Гродзенскага аблвыканкама, *старшыня аргкамітэта;* |
| Балашоў В.В. | намеснік старшыні раённага выканаўчага камітэта, *сустаршыня аргкамітэта (са згоды);* |
| Куратчык С.В. | намеснік начальніка ўпраўлення культуры Гродзенскага аблвыканкама, *сустаршыня аргкамітэта;* |
| Варабей А.А. | вядучы метадыст ДУК “Гродзенскі АМЦНТ”; |
| Грыгаран Т.У. | намеснік дырэктара ДУК “Гродзенскі АМЦНТ”; |
| Грынцэвіч А.А. | дырэктар ДУК “Гродзенскі раённы культурна-інфармацыйны цэнтр”; |
| Жук-Куніцкая І.Ю. | галоўны спецыяліст упраўлення культуры Гродзенскага аблвыканкама; |
| Кузьма Т.М. | начальнік аддзела культуры Гродзенскага райвыканкама; |
| Янучэня В.К. | дырэктар філіяла Абухаўскі цэнтр культуры ДУК “Гродзенскі раённы культурна-інфармацыйны цэнтр”. |

Дадатак № 2
да інструкцыі аб парадку арганізацыі і правядзення абласнога фестывалю народных хароў і ансамбляў песні і танца
“Над сінім Нёманам”

## СКЛАД ЖУРЫ

| | |
|---|---|
| Абразевіч І.К. | заслужаны дзеяч мастацтваў Рэспублікі Беларусь, галоўны хормайстар Нацыянальнага акадэмічнага хору Рэспублікі Беларусь імя Г. Цітовіча, *старшыня журы;* |
| Куратчык С.В. | намеснік начальніка ўпраўлення культуры Гродзенскага аблвыканкама, *сустаршыня журы;* |
| Урукіна Н.І. | заслужаны дзеяч культуры Рэспублікі Беларусь, мастацкі кіраўнік Заслужанага аматарскага калектыву Рэспублікі Беларусь узорнага ансамбля танца “Лялечкі” філіяла Абухаўскі цэнтр культуры ДУК “Гродзенскі раённы культурна-інфармацыйны цэнтр”, *намеснік старшыні журы;* |
| Варабей А.А. | вядучы метадыст ДУК “Гродзенскі АМЦНТ”; |
| Грыгаран Т.У. | намеснік дырэктара ДУК “Гродзенскі АМЦНТ”; |
| Жук-Куніцкая І.Ю. | галоўны спецыяліст упраўлення культуры Гродзенскага аблвыканкама; |

Дадатак № 3
да інструкцыі аб парадку арганізацыі і правядзення абласнога фестывалю народных хароў і ансамбляў песні і танца
“Над сінім Нёманам”

ЗАЦВЯРДЖАЮ
Начальнік аддзела (сектара) культуры
______________гар(рай)выканкама

**ЗАЯЎКА**
на ўдзел у абласным фестывалі народных хароў
і ансамбляў песні і танца “Над сінім Нёманам”

1. Намінацыя ______________________________________________________
2. Поўная назва калектыву ___________________________________________
3. База дзейнасці калектыву __________________________________________
4. Колькасць удзельнікаў калектыву ___________________________________
5. Прозвішча, імя, імя па бацьку кіраўніка калектыву ____________________
6. Кантактны тэлефон кіраўніка калектыву _____________________________________________________________________
7. Назва твораў (аўтар апрацоўкі, пастаноўшчык нумароў, без скарачэнняў) ___________________________________________________________
8. Працягласць гучання праграмы _____________________________________
9. Наяўнасць ансамбля народных інструментаў (прозвішча, імя, імя па бацьку кіраўніка, склад і колькасць інструментаў)_______________________________________________________
10. Наяўнасць фанаграмы “-1” (электронны носьбіт) _____________________________________________________________________
11. Неабходны тэхнічны райдар_________________________________________
12. Творчая характарыстыка калектыву (да 50 слоў) ____________________________________________________________(ці дадатак)
13. Відэа конкурсных нумароў (дадатак да заяўкі)
_____________________________________________________________________

Кіраўнік базавай установы ____________________________________________
(подпіс з расшыфроўкай)

Заяўкі на ўдзел у фестывалі дасылаць да 10 лістапада 2021 года на адрас: 230025, г. Гродна, вул. Савецкая, 8, ДУК “Гродзенскі абласны метадычны цэнтр народнай творчасці”. Кантактны тэлефон: +375152623802, тэл./факс: +375152623787, e-mail: omcnt@mail.grodno.by

Увага! Заяўка павінна быць у двух фарматах: PDF (з пячаткай і подпісам) і WORD.